НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ МОВАЗНАЎСТВА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА

УДК: 808. 26 - 311

ВАЛАСЕНКА АЛЕНА АЛЯКСАНДРАЎНА

# ВЫТВОРЧА-ПРАМЫСЛОВЫЯ ТАПАНІМІЧНЫЯ НАЗВЫ БЕЛАРУСІ

10. 02. 01 - беларуская мова

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Мінск - 2003

Работа выканана на кафедры беларускага мовазнаўства Установы адукацыі "Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт"

Навуковы кіраўнік — кандыдат філалагічных навук, прафесар Шур В. В., Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт, кафедра беларускага мовазнаўства

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук, дацэнт Прыгодзіч М. Р., Беларускі дзяржаўны універсітэт, кафедра гісторыі беларускай мовы

кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Капылоў І. Л., Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, аддзел лексікалогіі і лексікаграфіі

Апаніруючая арганізацыя — Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С.Пушкіна

Абарона адбудзецца 23 снежня 2003 г. у 14 гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д 01.43.01 у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, тэл. 284-15-94).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Аўтарэферат разасланы 22 лістапада 2003 г.

Вучоны сакратар
Савета па абароне дысертацый
Д 01.43. 01 Н.В.Паляшчук

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Праблемы і задачы, якія ставіць перад сабою і спрабуе вырашыць сучасная тапаніміка, вельмі разнастайныя. Актуальным у наш час з'яўляецца сістэмны падыход, калі даследуюцца сувязі і ўзаемаўплыў паміж элементамі тапанімічных сістэм, заканамернасці ўзаемадзеяння моўных фактараў са звесткамі іншых навук.

Нягледзячы на разнастайнасць прац па анамастыцы, вытворча-прамысловыя тапонімы Беларусі не атрымалі шырокага і сістэмнага навуковага асвятлення. Недастаткова даследаваным застаецца і складаны спектр пытанняў, звязаных са станаўленнем, функцыянаваннем і развіццём тапонімаў вытворча-прамысловага характару. Онімы вылучанай групы - гэта не толькі каштоўны лінгвістычны матэрыял, а і своеасаблівыя помнікі, у якіх адлюстравалася багатая інфармацыя аб шляхах грамадска-гістарычнага, сацыяльна-палітычнага і эканамічнага жыцця.

Вытворча-прамысловыя тапонімы, частка якіх архаізавалася, уяўляюць дастаткова шырокі пласт лексікі вытворчага характару. Гэтыя тапанімічныя рэаліі даюць магчымасць узнавіць малюнак вытворча-прафесійных заняткаў мінулых часоў. Даследуемыя онімы захоўваюць найкаштоўнейшы матэрыял як для лінгвістыкі, так і для этнаграфіі, культуры, археалогіі, геалогіі, гісторыі Беларусі.

Такім чынам, вытворча-прамысловыя тапонімы з'яўляюцца каштоўнай крыніцай інфармацыі як у лінгвістычным, так і ў гісторыка-эканамічным і геаграфічным аспектах.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне выканана ў межах тэмы "Беларуская анамастычная лексіка: праблемы і перспектывы яе сістэмнага даследавання" (№ 20002560) (2000 - 2002 гг.), якая ўваходзіла ў план навукова-даследчай працы кафедры беларускага мовазнаўства УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт" і каардынавалася навуковым саветам па мовазнаўству Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта дысертацыі - правесці комплексны аналіз вытворча-прамысловых тапонімаў Беларусі на лексіка-семантычным і структурна-словаўтваральным узроўнях, паказаць узаемасувязь і ўзаемаўплыў грамадска-гістарычных, сацыяльна-лінгвістычных фактараў на фарміраванне і станаўленне названых тапонімаў.

Для дасягнення гэтай мэты ставяцца наступныя канкрэтныя задачы:

- сабраць неабходны анамастычны і апелятыўны матэрыял шляхам распісвання друкаваных крыніц;
- правесці класіфікацыю вытворча-прамысловых тапонімаў паводле матывацыйных і словаўтваральных адзнак;
- ахарактарызаваць лексіка-семантычныя і структурна-граматычныя тыпы ўтваральных асноў з улікам іх прадуктыўнасці і лакалізацыі;
- выявіць фактары, якія абумовілі з'яўленне і функцыянаванне вытворча-прамысловых тапонімаў;
- раскрыць сутнасць і вызначыць спецыфіку перайменаванняў і новых найменняў вытворча-прамысловых тапонімаў, якія ўзніклі ў савецкі перыяд.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляюцца вытворча-прамысловыя тапонімы Беларусі. Прадмет даследавання - асаблівасці фарміравання, лакалізацыі, развіцця і функцыянавання вытворча-прамысловых тапонімаў Беларусі.

**Гіпотэза.** Вытворча-прамысловыя тапонімы Беларусі з'яўляюцца своеасаблівым адлюстраваннем характару матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва. Пэўныя грамадска-гістарычныя, сацыяльна-эканамічныя ўмовы накладваюць адбітак на станаўленне, пашырэнне і функцыянаванне такіх найменняў.

**Матэрыял даследавання.** У якасці асноўных крыніц пры зборы матэрыялу былі выкарыстаны слоўнікі назваў населеных пунктаў Беларусі Я. Рапановіча, а таксама: "Указатель населенным местностям Гродненской губернии", "Список населенных мест Витебской губернии", "Список населенных мест Минской губернии", "Список населенных мест Могилевской губернии", "Хроніка Убарцкага Палесся". Улічваліся звесткі з публіцыстычнай і мастацкай літаратуры, гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, дыялекталогіі, антрапанімікі. Агульная колькасць сабраных вытворча-прамысловых тапонімаў налічвае каля 1300 адзінак.

У дысертацыйным даследаванні пераважна аналізуюцца афіцыйна прынятыя назвы населеных пунктаў. Акрамя гэтага, разглядаецца пэўная колькасць найменняў, якія ў выніку розных прычын цяпер не існуюць (перайменаванне, знікненне паселішча).

**Метадалогія і метады даследавання.** У дысертацыйным даследаванні вытворча-прамысловыя тапонімы разглядаюцца як лінгвістычная з'ява, якая ўзнікае ў пэўных грамадска-гістарычных, сацыяльна-эканамічных умовах. Сінхронны аналіз вылучаных онімаў

спалучаецца з дыяхронным і праводзіцца з улікам фактаў этнаграфіі, гістарычных працэсаў, падзей. Асноўным у дысертацыі з'яўляецца апісальны метад, а пры ўстанаўленні матывацыйных характарыстык вытворча-прамысловых тапонімаў, выяўленні прадуктыўнасці словаўтваральных тыпаў выкарыстоўваліся супастаўляльны, параўнальна-гістарычны метады, прыводзяцца элементы статыстычнага аналізу.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў.** Вытворча-прамысловыя тапанімічныя назвы Беларусі ўпершыню становяцца аб'ектам комплекснага лінгвістычнага аналізу. У сферу навуковага ўжытку ўводзіцца мала даследаваны фактычны матэрыял у межах двух моўных узроўняў - лексіка-семантычнага і словаўтваральнага. Выяўлены ўплыў сацыялінгвістычных, культурных, эканамічных фактараў на характар тапалексем і іх лінгвагеаграфію. Вызначаны і даследаваны асноўныя лексіка-семантычныя тыпы тапонімаў вытворча-прамысловага характару, праілюстравана на картах ступень іх пашырэння і прадуктыўнасці, асаблівасці канцэнтрацыі і размеркавання ў прасторы, паказана адметнасць структурна-словаўтваральных тыпаў, выяўлены асаблівасці матывацыйнай базы і словаўтварэння гэтых тапонімаў у розныя перыяды, зроблены адпаведныя вывады.

**Практычная значнасць даследавання.** Атрыманыя ў дысертацыі вынікі і фактычны матэрыял даследавання могуць знайсці прымяненне ў практыцы пры складанні тапанімічных даведнікаў, папаўнення ўжо існуючых і стварэння новых дыялектных і тапанімічных слоўнікаў, у вучэбным працэсе вышэйшых навучальных устаноў - пры распрацоўцы і выкладанні спецкурсаў, напісанні дапаможнікаў па тапаніміцы, у якасці параўнальнага матэрыялу для тапанімічных даследаванняў, у краязнаўчай рабоце, пры падрыхтоўцы і напісанні курсавых і дыпломных работ, правядзенні конкурсаў, алімпіяд.

Вытворча-прамысловыя тапонімы, фарміраванне і развіццё якіх адбывалася на працягу некалькіх стагоддзяў, уяўляюць інтарэс у першую чаргу для моваведаў, гісторыкаў, этнографаў, сацыёлагаў, географаў.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. Даследуемы матэрыял дае магчымасць вылучыць разнастайныя лексіка-семантычныя групы, якія адлюстроўваюць асаблівасці матэрыяльнай культуры нашых продкаў, сацыяльна-палітычнага, культурнага, эканамічнага жыцця; дазваляе адзначыць іх шырокую спецыялізацыю ў галіне промыслаў, рамёстваў і адпаведна багацце

такой тапанімічнай наменклатуры. Арэалы канцэнтрацыі тапанімічных асноў вытворча-прамысловага характару, якія маюць рэальную гістарычную і геаграфічную аснову, у большасці выпадкаў супадаюць з тэрыторыяй, на якой былі пашыраны адпаведныя промыслы і рамёствы.

2. Для вытворча-прамысловых тапонімаў характэрны тыя ж структурна-граматычныя тыпы і словаўтваральныя мадэлі, што і для агульнай мовы, яе лексікі.

3. Характар тапонімаўтваральных асноў, іх структурнае афармленне дазваляюць прасачыць працэсы станаўлення вытворча-прамысловых тапанімічных тыпаў, выявіць заканамернасці іх фарміравання і развіцця.

4. Змены ў наменклатуры даследуемых онімаў савецкага часу былі абумоўлены перайменаваннем населеных пунктаў, знікненнем асобных аб'ектаў, новымі тэндэнцыямі ў намінацыі.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананым даследаваннем. Выяўлены, прааналізаваны асаблівасці станаўлення, развіцця і функцыянавання вытворча-прамысловых тапонімаў Беларусі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэнні кафедры беларускага мовазнаўства УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт". Па тэме даследавання былі зроблены даклады і паведамленні на Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Канцэптуальныя пытанні развіцця мовы, літаратуры і мастацтва ў святле праблем адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа" (Мазыр, 23 - 24 красавіка 1998 г.); Міжнароднай навукова-метадычнай канферэнцыі "Беларуская пачатковая школа: праблемы і перспектывы развіцця" (Мазыр, 29 - 30 верасня 1999 г.); Рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі "Актуальныя праблемы моўнай адукацыі вучняў ва ўмовах рэфармавання агульнаадукацыйнай школы" (Мазыр, 22 - 23 сакавіка 2001 г.); другой Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю з дня нараджэння прафесара Л.М.Шакуна (Мінск, 15 - 16 лістапада 2002 г.); навуковай канферэнцыі аспірантаў "Развитию полесского региона - энергию молодых учёных" (Мазыр, 26 - 27 чэрвеня 2002 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Культура мовы і грамадства" (Мінск, 5 - 6 снежня 2002 г.).

**Апублікаванасць вынікаў.** Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі выкладзены ў адзінаццаці апублікаваных работах агульным аб'ёмам 40 друкаваных старонак, у тым ліку ў пяці артыкулах, матэрыялах шасці навуковых канферэнцый.

**Структура і аб'ем дысертацыі.** Дысертацыйнае даследаванне складаецца з пераліку ўмоўных скарачэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстанай літаратуры (165 адзінак), дадатка.

Агульны аб'ём дысертацыі складае 121 старонку, з іх спіс выкарыстанай літаратуры займае 12 старонак, дадатак - 8 старонак. У рабоце змешчаны 12 карт, 2 дыяграмы.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** тлумачыцца выбар тэмы, вызначаецца ступень яе вывучанасці, фармулююцца мэты і задачы даследавання, асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, адзначаецца актуальнасць тэмы, навуковая навізна, тэарэтычная вартасць і магчымасць практычнага прымянення дысертацыі, указваецца метадычны арсенал і крыніцы даследавання.

**У першай** главе "*Лексіка-семантычная характарыстыка вытворча-прамысловых тапонімаў*" аналізуецца лексічны склад онімаў і семантыка апелятываў, якія паслужылі базай фарміравання тапонімаў, прыводзіцца іх лінгвагеаграфія.

Вытворча-прамысловыя тапонімы складаюць кампактны комплекс назваў, абумоўлены сацыяльнымі, палітычнымі, эканамічнымі, культурнымі фактарамі, спецыфікай грамадскага жыцця на пэўным гістарычным адрэзку часу. Даследаване многіх рарытэтных онімаў, якія ўзнікаюць на розных этапах развіцця грамадства і нясуць адбітак сваёй эпохі, становіцца магчымым і поўным толькі пры глыбокім і падрабязным вывучэнні экстралінгвістычных даных. Вылучаныя тапонімы разглядаюцца як моўная з'ява, якая мае рэальную грамадска-гістарычную аснову, таму абавязковай умовай даследавання вытворча-прамысловых тапонімаў з'яўляецца выкарыстанне інфармацыі з сумежных навук (гісторыі, этнаграфіі, геаграфіі).

Аналіз вытворча-прамысловых тапонімаў Беларусі даў магчымасць выявіць сярод іх некалькі лексіка-семантычных груп.

У колькасных адносінах пераважаюць тапонімы, суадносныя з *назвамі месцаў металаапрацоўкі і назвамі асоб, якія займаліся металаапрацоўкай* (28,7 % ад усіх зафіксаваных). Даволі пашыраны ў гэтай групе найменні, матываваныя апелятывам *рудня* - месца здабычы жалезнай руды, памяшканне для яе выплаўкі. Згодна з гістарычнымі і этнаграфічнымі крыніцамі, рэшткі руды, жалезных

складаюць *простыя* або аднасастаўныя найменні, якія ўжываюцца як у субстантыўнай *(Руда, Буда, Гута),* так і атрыбутыўнай формах *(Цагельнае, Млынавы, Трудавы).* Сярод простых тапонімаў у цэлым вылучаюцца назвы бязафікснага і суфіксальнага ўтварэння.

Адну са спецыфічных асаблівасцей складаюць *састаўныя тапонімы,* што ўяўляюць сабой лексікалізаваныя словазлучэнні: *Новая Рудня, Высокая Буда, Малы Млынок.* Функцыю апорнага кампанента выконвае субстантыў у сінгулятыўнай (*Новая Цагельня, Рудня Марымонава, Верхняя Рудня)* і ў плюратыўнай форме (*Малыя Кавалічы, Бліжнія Бондары, Новыя Ганчары),* на які і прыпадае асноўная сэнсавая нагрузка ўсёй намінацыі [2; 3, 8].

3. Характар тапонімаўтваральных асноў, структурны тып вылучаных онімаў залежаць ад грамадска-гістарычнага, культурна-гаспадарчага развіцця грамадства, ідэалагічнага напрамку эпохі, традыцый і новых тэндэнцый намінацыі. Так, для савецкага часу характэрнай рысай вытворча-прамысловых тапонімаў з'яўляюцца генітыўныя канструкцыі (4 %), якія ўтвараюцца з некалькіх кампанентаў: *Пасёлак прадпрыемства імя Р. К. Арджанікідзе, Пасёлак крухмальнага завода, Пасёлак Пячкавіцкага льнозавода, Пасёлак Чавускага цагельнага завода, Пасёлак цагельнага завода №37* і інш.

Сярод вытворча-прамысловых тапонімаў адзначаюцца апелятывы агульнаславянскага паходжання, а таксама мноства запазычанняў (пераважна з польскай, а праз яе пасрэдніцтва з іншых моў), якія адаптаваліся ў сучаснай беларускай мове на фанетычным і марфалагічным узроўнях. Наяўнасць іншамоўных элементаў у структуры тапонімаў абумоўлена рознымі фактарамі, сярод якіх геаграфічнае суседства тэрыторый, грамадска-эканамічныя, культурныя і моўныя сувязі народаў. Частка вытворча-прамысловых тапонімаў савецкага перыяду мае рускую лексічную аснову [1; 3, 6].

4. У выніку шматлікіх перайменаванняў і новых найменняў паселішчаў у савецкі час сфарміраваліся спецыфічныя тапонімы, якія прынцыпова адрозніваюцца ад традыцыйных, што ўзніклі ў папярэднія перыяды. Вылучаныя онімы, фарміраванне якіх праходзіла ва ўмовах карэнных пераўтварэнняў у сацыяльна-эканамічным, культурным, ідэалагічным жыцці грамадства, адрозніваюцца наяўнасцю разнастайных тэматычных груп, спецыфікай формы і зместу. Апелятывы ў асновах новых тапонімаў адлюстроўваюць многія навукова-тэхнічныя, грамадска-палітычныя, эканамічныя паняцці. У савецкі перыяд выяўляецца празмернае выкарыстанне стылістычна маркіраванай лексікі, нетрадыцыйнай для тапаніміі

папярэдніх часоў. Характэрнай адзнакай для новых тапонімаў таго перыяду з'яўлялася наяўнасць экспрэсіўнасці, сацыяльнага накірунку. Апрача назыўной функцыі, вытворча-прамысловыя тапонімы савецкага часу сумяшчалі і пэўную ідэалагічную канатацыю: неслі на сабе адбітак эпохі, месца ўзнікнення, з'яўляючыся такім чынам своеасаблівымі храналагізатарамі ці "люстэркамі гісторыі" [1; 5; 7].

## Спіс публікацый па тэме дысертацыі

### Артыкулы


1. Валасенка А.А. Змены ў сістэме прамысловых тапонімаў у савецкі час // Молодежь и наука на пороге III тысячелетия: Сб. науч. работ аспирантов. - Мозырь: МзГПИ, 2001. - С. 15 - 21.

2. Валасенка А.А. Састаўныя тапонімы як назвы аб'ектаў руднага промыслу на Беларусі // Актуальныя пытанні беларускай лінгвістыкі (да 80-годдзя прафесара М.С.Яўневіча): Зб. навук. арт. - Мн.: БДПУ, 2002. - С. 30 - 33.

3 Валасенка А.А. Лексіка-граматычныя асаблівасці састаўных тапонімаў Беларусі // Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта, 2003, № 1 (8). - С. 53 - 57.

4. Валасенка А.А. Структурныя асаблівасці тапонімаў бандарнага рамяства // Роднае слова, № 5, 2003. - С.46 - 48.

5. Валасенка А. А. Аб неабходнасці вывучэння тапанімічных назваў у школе і ВНУ// Молодежь и наука на пороге III тысячелетия: Сб. науч. работ аспирантов. - Мозырь: МзГПУ, 2003. - С. 130 - 132.


### Матэрыялы канферэнцый


6. Валасенка А.А. З гісторыі некаторых прамысловых тапонімаў Беларусі // Канцэптуальныя пытанні развіцця мовы, літаратуры і мастацтва ў святле праблем адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа: Матэрыялы Рэсп. навук. канф., 23 - 24 красавіка 1998 г. - Мазыр: МзДПІ, 1998 г. - С. 42 - 44.

7. Валасенка А.А. Краязнаўчыя веды як фактар выхавання малодшых школьнікаў // Беларуская пачатковая школа: праблемы і перспектывы развіцця: Матэрыялы міжнар. навук.-метад. канф., 29 - 30 верасня 1999 г. / Пад рэд. В. В. Валетава: У 3 ч. - Мазыр: МзДПІ. -Ч. 1. - 1999. - С. 53 - 55.

8. Валасенка А.А. Тапонімы бандарнага рамяства на Беларусі

// Пісьменнік - мова - стыль: Матэрыялы II Міжнар. навук. канф., прысвечанай 75-годдзю з дня нараджэння праф. Л.М.Шакуна, 15 - 16 лістапада 2001 г. / Рэдкал.: М. Р. Прыгодзіч і інш.: У 2 т. - Мінск: РІВШ БДУ. - Т.1. - 2001. - С. 158 - 160.

9. Валасенка А.А. Лексіка-семантычныя тыпы вытворча-прамысловых тапонімаў Беларусі // Актуальныя праблемы моўнай адукацыі вучняў ва ўмовах рэфармавання агульнаадукацыйнай школы: Матэрыялы рэсп. навук.-метад. канф., 22-23 сакавіка 2001 г. / Пад рэд. В.В.Валетава. - Мазыр: МДПІ, 2001. - С. 13 - 16.

10. Валасенка А.А. Тапанімічныя адзінкі як крыніца вывучэння гісторыі народа (на аснове аналізу тапонімаў Гомельшчыны з асновай *буд)* // Развитию полесского региона - энергию молодых учёных: Материалы науч. конф. аспирантов, 26-27 июня 2002 г. / Под ред. Н. Н. Егорова. - Мозырь: МзГПУ, 2002. - С. 209 - 211.

11. Валасенка А.А. Тапанімічныя назвы бортнага промыслу на Беларусі // Культура мовы і грамадства: Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., 5 - 6 снежня 2002 г. - Мінск: БДПУ, 2002. - С. 20 - 22.

# РЭЗЮМЭ

Валасенка Алена Аляксандраўна

## Вытворча-прамысловыя тапанімічныя назвы Беларусі

**Ключавыя словы:** апелятыў, тапонім, антрапонім, онім, айконім, лінгвагеаграфія, анімізацыя, грамадска-гістарычныя ўмовы, тапонімаўтваральная аснова, гідронім, матывацыя, тапанімія, умоўна-сімвалічнае найменне, тапанімічная аманімія, лексема.

**Аб'ектам даследавання** ў дысертацыі з'яўляюцца вытворча-прамысловыя тапонімы Беларусі.

**Прадмет даследавання** - асаблівасці фарміравання, развіцця і функцыянавання вытворча-прамысловых тапонімаў, іх лінгвагеаграфія.

**Мэта даследавання** - правесці комплексны аналіз вытворча-прамысловых тапонімаў Беларусі на лексіка-семантычным і структурна-словаўтваральным узроўнях, паказаць узаемасувязь і ўзаемаўплыў грамадска-гістарычных, сацыяльна-лінгвістычных фактараў на фарміраванне і станаўленне названых тапонімаў.

**Метады праведзенага даследавання** - апісальны, супастаўляльны, параўнальна-гістарычны, прыводзяцца элементы статыстычнага аналізу.

**Навуковая навізна** дысертацыі ў тым, што ўпершыню сістэмна апісаны вытворча-прамысловыя тапонімы Беларусі, прааналізаваны іх лексіка-семантычныя і структурна-словаўтваральныя асаблівасці, выяўлена лінгвагеаграфія найменняў, прасочаны адметнасці матывацыйнай базы і словаўтварэння ў розныя перыяды.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыял і вынікі даследавання могуць быць прыменены пры складанні тапанімічных даведнікаў, пры падрыхтоўцы і напісанні курсавых і дыпломных работ, у краязнаўчай рабоце, паслужаць крыніцай інфармацыі для лінгвістаў, гісторыкаў, географаў, этнографаў, археолагаў.

# РЕЗЮМЕ

Волосенко Елена Александровна

## Производственно-промысловые топонимические названия Белоруссии

**Ключевые слова**: апеллятив, топоним, антропоним, оним, ойконим, лингвогеография, онимизация, общественно-исторические условия, топонимообразующая основа, гидроним, мотивация, топонимия, условно-символическое наименование, топонимическая омонимия, лексема.

**Объектом исследования** в диссертации являются производственно- промысловые топонимы Белоруссии.

**Предмет исследования** - особенности формирования, развития и функционирования производственно-промысловых топонимов, их лингвогеография.

**Цель исследования** - провести комплексный анализ производственно-промысловых топонимов Белоруссии на лексико-семантическом и структурно-словообразовательном уровнях, показать взаимосвязь и взаимодействие общественно-исторических, социально-лингвистических факторов на формирование и становление исследуемых топонимов.

**Методы проведенного исследования** - описательный, сопоставительный, сравнительно-исторический, приводятся элементы статистического анализа.

**Научная новизна** диссертации заключается в том, что впервые системно описаны производственно-промысловые топонимы Белоруссии, проанализированы их лексико-семантические и структурно-словообразовательные особенности, определена лингвогеография наименований, прослежены особенности мотивирующей базы и словообразования в разные периоды.

**Практическая значимость полученных результатов.** Материал и результаты исследования могут быть применены при составлении топонимических справочников, при подготовке и написании курсовых и дипломных работ, в краеведческой работе, послужат источником информации для лингвистов, историков, географов, этнографов, археологов.

## SUMMARY

Volosenko Elena Alexandrovna

**Production-fields toponymic names of Belarus**

**Key words:** appellative, toponym, anthroponym, onym, oikonym, linguistic geography, onymization, social-historical circumstances, base of toponymic formation, hydronym, motivation, toponymy, nominal-symbolic designation, toponimical homonymy, lexeme.

**The object of the research** is the production-fields toponyms of Belarus.

**The subject of the research** is the specific features of formation, development and functioning of the production-fields toponyms, there linguistic geography.

**The aim of the research** is the complex analysis of the production-fields toponyms covering lexical-semantic and structural levels; to show intercommunication and interaction of social-historical, social-linguistic factors on the forming and making of the research toponyms.

**The methods of the research** - descriptive, comparable, comparative -historical, the elements of the statistical analysis.

**The scientific novelty of the dissertation.** It's the first time that the production-fields toponyms of Belarus are systematically described, their lexical-semantic and structural-derivative peculiarities are analyzed, linguistic geography of names is determined, the peculiarities of motivated base and word formation in different periods are revealed.

**The practical importance of the received results.** The material and the results of the research can be applied for compiling toponymic directories, for working out and carrying out research and degree works, for area studies. The material of the research can be a good source of information for linguists, historians, geographers, ethnographers, and archeologists.